Перакладаў са старацаркоўнаславянскай мовы на беларускую пастар Лукаш Дзекуць-Малей, Антон Луцкевіч апрацаваў літаратурна і спраўдзіў з грэцкім арыгіналам. Апрача іх над перакладам працавалі Браніслаў Тарашкевіч, Радаслаў Астроўскі, Адам Станкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Аляксандр Коўш, а таксама настаўнікі і вучні беларускай гімназіі ў Вільні[5].

У гадах 1933—1939 Ян Пятроўскі выдаў часопіс "Сьветач Хрыстовае Навукі", а ў 1927 г. дадатак да "Pielgrzyma Polskiego" "Дух і праўда" на беларускай мове. Баптысты ў гадах 1927—1928 рэдагавалі "Беларускую балонку" ў рускамоўным часопісе "Маяк".

Такім чынам, багатая беларуская рэлігійная літаратура была вынікам працы сьведамых беларусаў — духавенства і сьвецкіх дзеячаў, звязаных з рознымі канфесіямі. Усё гэта адбывалася ў часе, калі ў Савецкай Беларусі вялася вострая антырэлігійная прапаганда.

---

[1] Stankievič A. Biełaruski chryścijanski ruch. Vilnia, 1939. S. 37.

[2] Карский Я. Белорусы. Петроград, 1922. Т. 3, ч. 3. С. 166; Журня Ф. Беларускія рэлігійныя выданьні XIX—XX стст. // Божым шляхам. 1972. № 4 (132).

[3] Głogowska H. Białoruskie wydawnictwa religijne w II Rzeczypospolitej a białoruski ruch narodowy // Narod i religia. Gdańsk, 1994. S. 145.

[4] Тамсама. С. 146.

[5] Picarda G. A study of the origins of the Byelorussian New Testament and Psalms (1931) // Божым шляхам. 1975. N 1—2. С. 20—21.

## Прыватнае кнігадрукаванне Мінска ў XIX стагоддзі

*Ларыса ДОЎНАР, спаборнік, супрацоўнік Аддзела рэдкай кнігі бібліятэкі Беларускага універсітэта культуры*

Пераломным момантам у кнігавыдавецкай справе Мінска стала XIX стагоддзе. Была скасавана екацярынінская забарона вольнага друку і дазволена прыватнае кнігадрукаванне.

Пачынальнікам прыватнага кнігадрукавання ў Мінску стала яўрэйская друкарня, дзейнасць якой бярэ адлік з 1807 г. Па нашых меркаваннях, гэта было сямейнае прадпрыемства Бланштэйнаў (1807—1836), якія прычыніліся да 13 выданняў на яўрэйскай мове пераважна рэлігійнага зместу. У 1837 г. яўрэйскае кнігадрукаванне было забаронена.

З другога дзесяцігоддзя ў Мінску пачалі сваю дзейнасць друкары І.Стэфановіч (1817—1848) і З.Прэс (1818—1835). Кнігі, выдадзеныя імі, былі разнастайныя па змесце: пратаколы паседжанняў, падручнікі, мастацкія кнігі. Акрамя выданняў на польскай мове былі два на рускай і адно на латыні. У 1833 г. у друкарні І.Стэфановіча, колішняга тыпографа Губернскай друкарні, была выдадзена першая мінская мініяцюрная кніга "Подарок благонравным ученикам и ученицам..." А.Паўлава.

Мастацкія кнігі, асабліва мясцовых аўтараў, займалі вядучыя пазіцыі ў рэпертуары мінскіх друкароў. Лідэрам у гэтай справе стала друкарня Ёкеля Дворца, набытая ім ад Стэфановіча ў канцы 40-х гадоў. У 50—60-я гады XIX ст. Ё.Дворац супольна з выдаўцамі братамі Бейлінамі, якія мелі на той час у Мінску кнігарню,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдаў беларуска-польскія творы В.Дуніна-Марцінкевіча, польскія — М.Б.Шышкі, М.Лойкі, Ул.Сыракомлі і іншых.

Кнігавыдавецкая справа і кніжны гандаль нярэдка знаходзіліся ў адных руках. Вядомы літаратар, музыкант і музычны крытык Аляксандр Валіцкі, які меў у Мінску кнігарню, займаўся і выдавецкай дзейнасцю (50—60-я гг. XIX ст.). Ён адзін з першых пачаў у Мінску нотадрукаванне (Miladowski F. Polonez. 1860; Spiewy polskie). Настаўнік гімназіі Эмерык Адамовіч (1854—1870-я гг.), у якога была свая літаграфія, акрамя літаратуры для вучняў спрабаваў таксама друкаваць нотна-музычныя творы.

Мінскія выданні гэтага перыяду актыўна ілюстраваліся ў мясцовай літаграфіі Фалька (40—50-я гг. XIX ст.). Дзейнасць Фалька адзначана таксама картаграфічнымі і навучальнымі выданнямі.

У якасці выдаўцоў выступалі не толькі друкары, але і прыватныя асобы — аўтары, перакладчыкі (Ігнат Легатовіч).

Актыўнае культурнае жыццё, творчая і грамадская дзейнасць мінскай інтэлігенцыі ўплывала на дэмакратызацыю мясцовага кнігадрукавання. 50—60-я гады XIX ст. сталі яскравым прыкладам таму.

Пачынаючы з 70-х гадоў паліграфічная база кнігадрукавання ўзрастае і пашыраецца. Узнікаюць новыя друкалітаграфіі: Саламонава, Тасьмана, Дворжацаў, Каплана, Кліорынай, Нахумава, Арэмборскага, Фрэнкеля, Блюмовіча, Вільковіча, Бамштэйна. Павялічваюцца аб'ёмы выпуску кніжнай прадукцыі. Аднак не ўсе друкарні існавалі працяглы час. Так, сем з дванаццаці мінскіх прыватных друкарняў у другой палове XIX ст. спынілі сваю дзейнасць, выдаўшы ўсяго па адной-дзве кнігі. Некаторыя з іх аб'ядноўваліся дзеля сумеснай працы і супрацьстаяння канкурэнтам (Тасьман і Левін, Дворжац і Каплан).

Вядучае становішча даволі працяглы час займалі тры выдавецтвы: Б. І. Саламонава (1874—1900-я гг.), Х. Я. Дворжаца (1870-я—1900-я гг.), І. Тасьмана (1881—1900-я гг.). У друкалітаграфіі мінскага купца, якая размяшчалася ў яго прыватным доме, выкарыстоўваліся "розныя рускія і французскія шрыфты...", а таксама "сорак сем літаграфскіх камянёў". Акрамя афіцыйнай і клерыкальнай літаратуры Б.Саламонаў выдаваў мовазнаўчую і гістарычную, каталогі кніг і інш. Друкарня Х.Я.Дворжаца аддавала перавагу выданням сельскагаспадарчай і краязнаўчай тэматыкі, сярод якіх былі навуковыя, навучальныя, прыкладныя, інфармацыйныя і інш. І. Тасьман спецыялізаваўся на выданні кніг па асвеце, медыцыне. Сярод частых аўтараў выдаўца быў вядомы мінскі літаратар Д. Бохан. Ведучы тыпаграфскае прадпрыемства разам з Ш. А. Левіным, колішнім наборшчыкам Мінскай губернскай друкарні, яны паступова набылі машыны хуткадруку з С.-Пецярбурга і Лейпцыга, два бастонскія прэсы з Варшавы, берлінскі літаграфічны станок і рэзальную машыну. Прымяненне літаграфскага друку давала магчымасць удасканальваць афармленне кніг, аздабляючы цвёрдую вокладку дэкаратыўным арнаментам, малюнкамі, што спалучалася з невысокімі на гэта выдаткамі. Аднак панавальнае становішча заставалася за выданнямі на таннай шэрай паперы ў мяккай вокладцы.

Значную колькасць рэпертуару прыватных друкарняў другой паловы XIX ст. складаюць афіцыйныя справаздачы, працы розных грамадскіх і дзяржаўных устаноў, навуковых таварыстваў. Амаль знікаюць польскамоўныя выданні. Забаронены беларускі друк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На працягу XIX ст. у Мінску ў розныя яго перыяды дзейнічала больш як дваццаць прыватных выдавецтваў, выпуск кніжнай прадукцыі ў якіх (паводле нашых звестак) пераважваў у два разы дзяржаўны друк: Губернскай друкарні, Губернскага статыстычнага камітэта. Дзейнасць прыватных друкарняў працякала ва ўмовах залежнасці ад палітыкі царскай улады, жорсткага цэнзурнага кантролю, з аднаго боку, і кан'юнктуры кніжнага рынку — з другога.

## Галіновыя перыядычныя выданні Беларусі другой паловы XIX — пачатку XX ст.

*Наталля БЯРОЗКІНА, канд. гіст. навук, заг. аддзела навукова-арганізацыйнай работы ЦНБ імя Я.Коласа АН Беларусі*

Першым галіновым выданнем Беларусі былі "Записки Горы-Горецкого земледельческого института" (1852—1856), друкаваны орган першай у Расіі і адной з першых у Еўропе вышэйшай сельскагаспадарчай навучальнай установы. Усяго выйшла 6 нумароў часопіса.

Потым выпуск галіновых перыядычных выданняў непасрэдна на тэрыторыі Беларусі спыніўся. У 1860 г. у горадзе Вільня, які быў у тым часе культурным і адміністрацыйным цэнтрам Паўночна-Заходняга краю, астраном М.Гусеў і фізік К.Чаховіч пачалі выдаваць першы ў Расіі спецыяльны матэматычны часопіс — "Вестник математических наук". Выйшлі два тамы часопіса ў 40 выпусках. У часопісе таксама змяшчаліся артыкулы па фізіцы, механіцы, астраноміі, геадэзіі, фізічнай геаграфіі, бібліяграфічныя матэрыялы.

Выпуск галіновых перыядычных выданняў на Беларусі аднавіўся толькі ў 1901 г., калі ў якасці дадатку да неафіцыйнай часткі "Могилевских губернских ведомостей" пачаў выходзіць друкаваны орган Магілеўскага таварыства сельскай гаспадаркі — "Сельскохозяйственный листок", з 1902 да 1904 г. — "Могилевский листок сельского хозяйства и охоты".

З 1912 г. у Вільні, а з 1914 г. у Мінску выдаваўся першы сельскагаспадарчы часопіс на беларускай мове "Саха". За актуальнасць сваіх матэрыялаў "Саха" была ўзнагароджана сярэбранымі медалямі на сельскагаспадарчых выстаўках у Вільні (1913) і Мінску (1914). Рэдактарам часопіса быў вядомы беларускі выдавец і грамадскі дзеяч А.М.Уласаў, які быў рэдактарам газеты "Наша ніва" (1906—1914), разам з Цёткай (А.Пашкевіч) выдаваў у Мінску літаратурна-навуковы часопіс "Лучынка" (1914).

Распаўсюджаннем медыцынскіх ведаў актыўна займалася Таварыства мінскіх урачоў, якое выдавала свае працы і пратаколы пасяджэнняў, а таксама штомесячны часопіс "Минские врачебные известия" (1910—1915).

У 1911 г. у Мінску была адкрыта доследная балотная станцыя, якая стала цэнтрам вывучэння і практычнага выкарыстання балот у Расіі. З 1912 да 1916 г. выдаваўся часопіс "Болотоведение", прысвечаны перш за ўсё дзейнасці Мінскай балотнай станцыі. Але яго змест быў значна шырэйшы — на старонках часопіса друкаваліся нават матэрыялы даследаванняў замежных вучоных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ